*“У Біблії ўсе законы і правы , якімі людзі на зямлі кіравацца маюць, напісаныя... Тут справа ўсякага збору людзкога і ўсялякага гораду выкладаецца, каб вераю, яднаньнем ласкі й згоды паспалітае памножана была.”*
Францішак Скарына

*“Сьвецкія вернікі ня могуць адмовіцца ад узелу ў “палітыцы”, гэта значыць, у рознага роду эканамічнай, сацыяльнай, заканадаўчай, адміністрацыйнай і культурнай дзейнасьці, арганічна і інстытуцыйна прызначанай спрыяць агульнаму дабру.”*
Ян Павал II, Апостальскі зварот “Christifideles laid”

*“Прымаючы ўдзел у палітычных працэсах, праваслаўны сьвецкі заклікаsuccessfully засноўваць сваю дзейнасьць на нормах эвангельскай маралі , на еднасьці, справядлівасьці і літасьці, на клопаце аб духоўным і матэрыяльным дабры людзей, на любові да Бацькаўшчыны, на імкненьніператвараць навакольны сьвет паводле слова Хрыста.”*
Асновы сацыяльнай канцэпцыі Рускай Праваслаўнай Царквы.

*“А калі ёсьць рознасьць нямалая ў веры хрысьціянскай... абяцаем сабе за нас, за нашчадкаў нашых, на вечныя часы, пад абавязкам прысягі, пад вераю, годнасьцю і сумленьнем нашым, каб тыя, хто розныя ў веры, спакой між сабой захавалі.”*
Са Статута ВКЛ 1588 г.

*“Дзяржаўныя людзі могуць распрацоўваць пляны і меркаваць пра свабоду, але толькі рэлігія і мараль здольныя спарадзіць прынцыпы, у якіх свабода знойдзе цьвёрды падмурак. Патрыёт павінен быць рэлігійным чалавекам.”*
Джон Адамс, 2-гі прэзідэнт ЗША

*“Бог стварыў чалавека, каб ён карыстаў з вольнасьці справядлівай.”*
Кастусь Каліноўскі



## НАШЫ ЛІДЭРЫ



**Павал Севярынец**, у 1997 - 2004 гг. лідэр Маладога Фронту, у 1999 - 2003 гг. намесьнік старшыні БНФ. У 2005 - 2007 гг. адбывае два гады “абмежаваньня волі” на лесапавале. Пісьменьнік, аўтар 5 кнігаў, ляўрэат літаратурнай прэміі імя Алеся Адамовіча. Сустаршыня Аргкамітэту БХД.



**Аляксей Шэін**, у 2000 - 2004 гг. намесьнік старшыні Маладога Фронту, у 2005 - 2006 гг. прэс-сакратар, затым сьпічрайтэр Аляксандра Мілінкевіча, дэмакратычнага кандыдата на прэзыдэнцкіх выбарах. Журналіст. Сустаршыня Аргкамітэту БХД.



**Віталь Рымашэўскі**, у 2001 - 2003 гг. сябра Прэзыдыюму Беларускай Нацыянальнай Маладзёвай Рады, у 2005 - 2006 гг. мэнэджэр выбарчай кампаніі Аляксандра Мілінкевіча ў Менску, з 2007 г. каардынатар руху “За свабоду” ў Менску. Сустаршыня Аргкамітэту БХД.



**Георгі Дзьмітрук**, лідэр “Хрысьціянскай Бізнэсовай Ініцыятывы”. Сустаршыня Аргкамітэту БХД.

**Кантакты**:

+375 29 5160861 (Павал)
+375 29 6512665 (Аляксей)
+375 29 7635954 (Віталь)

**E-mail: bchd.info@gmail.com**
**Сайт: www.bchd.info**
**220109, а/с 290, Менск, Беларусь**



Аргкамітэт па стварэньні

# БЕЛАРУСКАЯ ХРЫСЬЦІЯНСКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ

# БХД

## ХРЫСЬЦІЯНСКІЯ ПРЫНЦЫПЫ І БЕЛАРУСКІ ПАТРЫЯТЫЗМ

## ХРЫСЬЦІЯНСКІЯ ПРЫНЦЫПЫ І БЕЛАРУСКІ ПАТРЫЯТЫЗМ

Беларусь востра патрабуе палітычнай сілы, дзейнасьць якой заснаваная на падмурку хрысьціянскіх прынцыпаў і беларускага патрыятызму. Такой новай сілай павінна стаць Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя.

Арыенцірам у нашай дзейнасьці зьяўляецца праца такіх беларускіх дзеячоў-хрысьціянаў, як Еўфрасіньня Полацкая, Кірыла Тураўскі, Канстанцін Астрожскі, Францішак Скарына, Мікалай Радзівіл Чорны, Астафій Валовіч, Язэп Руцкі, беларускія хрысьціянскія дэмакраты пачатку XX стагодзьдзя.




*Хрысьціянскія дэмакраты на шэсьці*

Сёньня мы зноў узьнімаем сьцяг Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі, бо перакананыя: менавіта хрысьціяне-патрыёты мусяць быць лідэрамі беларускай палітыкі.

**Беларуская хрысьціянская дэмакратыя выступае за пабудову незалежнай, эўрапейскай, эканамічна і духова разьвітай Беларусі, якую даў нам Госпад Бог.**



## ШТО ТАКОЕ ХРЫСЬЦІЯНСКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ?

**Гэта ідэя, якая грунтуецца на хрысьціянскіх маральных каштоўнасьцях. Хрысьціянства ў спалучэньні з дэмакратыяй для нас - гэта прыўнясеньне хрысьціянскіх маральных прынцыпаў у палітыку на розных яе ўзроўнях: у эканоміку, сацыяльную сфэру, культуру, адукацыю, іншымі словамі, - любую галіну жыцьця, зь якой сутыкаецца чалавек.**

## ЗА ШТО ВЫСТУПАЕ ХРЫСЬЦІЯНСКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ?

- за сумленную, маральную, адказную палітыку;
- за аброну хрысьціянскіх каштоўнасьцяў ва ўсіх сфэрах жыцьця;
- за першынство закону як грунту справядлівага дзяржаўнага ладу й грамадзкага парадку;
- за дзяржаву, якая стварае максімальна спрыяльныя ўмовы для росквіту сям'і й разьвіцьця асобы;
- за незалежную Беларусь;
- за прыватную ўласнасьць як гарантыю індывідуальнай свабоды;
- за разьвіцьцё беларускай культуры і дыялёг зь іншымі культурамі;
- за разумнае экалягічнае гаспадараньне на сваёй зямлі;
- за адкрытую палітыку ў адносінах з усім сьветам;
- за моцнае мясцовае самакіраваньне;
- за спрашчэньне бюракратычных працэдур і зьніжэньне падаткаў;
- за свабоду сумленьня й хрысьціянскую талерантнасьць.



## ДЗЕЙНАСЬЦЬ

У 2007 - 2009 гг. беларускія хрысьціянскія дэмакраты сталі ініцыятарамі правядзеньня **Кампаніі за свабоду сумленьня**, і разам з цэрквамі сабралі больш як 50.000 подпісаў за зьмену драконаўскага “Закону аб свабодзе сумленьня”;

- Арганізавалі па ўсёй краіне шырокую ініцыятыву **“Пакаяньне”**, прымеркаваную да 90-х угодак камуністычнай рэвалюцыі й 70-годзьдзя піку сталінскіх рэпрэсіяў;



*Канфэрэнцыя БХД*

- Разгарнулі кампанію **супраць магіі й акультызму ў СМІ**, якую падтрымалі Праваслаўная і ўсе Пратэстанцкія цэрквы: у выніку 13 верасьня 2008 г. рэкляма д'ябальшчыны ў Беларусі была афіцыйна забаронена.

- Выдалі шматлікія газэты й брашуры, сэрыю музычных CD “Беларускі Хрысьціянскі Хіт”, хрысьціянскі відэа клуб; правялі тысячы сустрэчаў для хрысьціянаў і патрыётаў; зьбіраюць ахвяраваньні для былых вязьняў ГУЛАГу, праводзяць курсы беларускай мовы, гісторыі беларускага хрысьціянства, грамадзкага лідэрства.

- Распачалі **кампанію ў абарону сямейных каштоўнасьцяў** (супраць алькагалізму, абортаў, разводаў, разбэшчанасьці).

Зборы аднадумцаў у больш як 100 гарадох і раёнах Беларусі; дынамічны рост і разьвіцьцё - гэта **БХД** цяпер.